ПАДЗЕЯ



# З ПАКЛОНАМ ДА ПАНІ ЭЛІЗЫ

**У Гродне адзначылі 180-ю гадавіну з дня нараджэння Элізы Ажэшкі. Аматараў творчасці сусветна вядомай гродзенскай пісьменніцы 6 чэрвеня яе Дом-музей сустракаў цэлым шэрагам тэматычных мерапрыемстваў. У літаратурна-музычным салоне «Эліза Ажэшка запрашае сяброў» выступіла дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

Ёсць гістарычныя постаці, без якіх немагчыма ўявіць сабе наш горад, яго мінулае і сучаснасць. Да такіх постацяў адносіцца Эліза Ажэшка. Асоба і лёс пісьменніцы цалкам звязаныя з Гродна і гродзенцамі, а ў сюжэтах яе твораў пабудаваны рэалістычныя вобразы тыповых сялян і гараджан, прадстаўнікоў розных грамадскіх слаёў эпохі пазамінулага стагоддзя. Чалавечыя ўзаемаадносіны, будні і святы, радасці і нягоды, жыццёвая філасофія таленавіта, па-майстэрску апісаны Элізай Ажэшкай і, як каштоўны ўрок сілы духу, любові, высакароднасці, выкладзены ўсім нам, яе землякам эпохі XXI стагоддзя. Пісьменніца вядомая і любімая намі таксама за сваю падзвіжніцкую, дабрачынную дзейнасць. Дапамагаць тым, хто трапіў у бяду, немаёмным і прыгнечаным – было жыццёвым крэда Элізы Ажэшкі, актыўнага грамадскага актывіста, адважнага змагара з няроўнасцю і прыгнётам. Дэмакратызм, абвостранае пачуццё справядлівасці, гуманістычныя перакананні, імкненне да гармоніі ва ўсім характарызуюць не толькі герояў прозы польскай пісьменніцы, але ў першую чаргу яе самую. Шматлікія культурна-асветніцкія праекты, вядомы і паважаны ў горадзе літаратурна-музычны салон, як і арыстакратычныя свецкія балы, таксама назаўсёды звязаны з асобай пані Элізы. На ўсё гэта народ адказваў пісьменніцы сваёй шчырай любоўю. У гэтай народнай любові не існавала штучных абмежаванняў, нацыянальнай ды класавай прыналежнасці. Нават час няўладны над ёй.



Выступленні ўдзельнікаў святочнага літаратурна-музычнага салону «Эліза Ажэшка запрашае сяброў» сталі сапраўды сяброўскім працягам даўніх традыцый. Кожны ўдзельнік святочнай праграмы прама альбо ўскосна прысвячаў свой паклон несмяротнаму вобразу вялікай гродзенкі. Па задумцы арганізатараў святочных мерапрыемстваў – супрацоўнікаў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага, тэма юбілеяў гродзенскіх класікаў айчыннай літаратуры была развіта яшчэ і ва ўшанаванні 130-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта Максіма Багдановіча. Сцэнарый святочнага салона ў пані Элізы ўключаў аўтарскія літаратурныя чытанні, а таксама выступленні чытальнікаў-дэкламатараў, музычныя і харэаграфічныя нумары. Больш падрабязна – у нашым фотарэпартажы.



Узначаліла дэлегацыю ГрАА СПБ лідар Гродзеншчыны літаратурнай Людміла Антонаўна Кебіч. Вядомая не толькі ў вобласці, у Беларусі, але і далёка за межамі краіны беларуская паэтэса прачытала вершаванае філасофскае прысвячэнне вобразу Элізы Ажэшкі. Літаратурна-музычную праграму працягнулі калегі па Саюзу пісьменнікаў Беларусі і кандыдаты на ўступленне ў яго шэрагі. З уласнымі творчымі «паклонамі» пані Элізе выступілі: літаратуразнаўца Аліна Сабуць, паэты Дзмітрый Радзівончык, Анатоль Апанасевіч, Антаніна Нурэтдзінава, Кацярына Ігнацюк. Пранікнёным выкананнем некалькіх лірычных песень свята ўпрыгожыў паэт, аўтар і выканаўца Андрэй Татур. Госць з Мінска, кінамеладэкламатар Юрый Рэдзькоў выступіў з акцёрскім чытаннем верша Роберта Раждзественскага. Як адзначыла ў сваёй прамове дырэктар Дзяржаўнай установы культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага» Марына Эдвардаўна Ігнатовіч, каб захоўваць і памнажаць скарбонку слаўных традыцый, якія пакінула нам Эліза Ажэшка, неабходна часцей прыходзіць у яе Дом-музей, ладзіць тут салонныя творчыя сустрэчы, працягваць арганізацыю дабрачынных мерапрыемстваў і свецкіх баляў… Трымацца разам – толькі так магчыма дабіцца плёну ад распачатага пісьменніцай дыялогу эпох.























***На фота злева направа:*** **Людміла Кебіч, Аліна Сабуць, Анатоль Апанасевіч, Дзмітрый Радзівончык, Антаніна Нурэтдзінава, Кацярына Ігнацюк, Юрый Рэдзькоў.**






**Уладальнік ганаровага тытула «Адкрыццё года-2020», паэт, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур**

Як і было задумана арганізатарамі святочнай вечарыны да 180-годдзя з дня нараджэння Элізы Ажэшкі, у атмасферы салона, напоўненай духам чалавекалюбства, радасцю ад жыцця і любоўю да мастацтва, змяшаліся вытанчанасць і аскетызм, шляхетнасць і народнасць. Менавіта такой шматграннай, living рознабаковай з'явай, крыніцай гармоніі, пачуццёвасці і натхнення, бачыла чалавечае жыццё Эліза Ажэшка, наша адзіная і непаўторная пані Эліза, узор лепшага са ўсяго, што было ёсць і будзе на крутых берагах Нёмана.

2021 год на Гродзеншчыне адзначаны некалькімі важкімі юбілеямі класікаў айчыннай літаратуры. Гэтыя асобы розныя па сваіх лёсах і сваёй творчасці. Але ў іх ёсць адна адметная рыса, якую нельга не заўважыць і не ўзяць сабе на ўзбраенне. Гэта ідэя еднасці розных культур і народаў, ідэя аб'яднання вакол мастацтва, вакол імкнення з цемры да святла, верай у якую і жылі нашы продкі ў свае нялёгкія часы. Продкі жылі і нам завяшчалі. Калектыў арганізацыі, у назве якой на першым месцы стаіць слова «саюз», ва ўсе часы верны гэтаму запавету.

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***



**Кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая**




ELIZIE
ORZESZKOWEJ